# 109-я гадавіна з дня нараджэння У. І. ЛЕНІНА

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЗНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (1240) ● 19 красавіка 1979 г. Цана 2 кап.



## Ленінскія традыцыйныя

На гістарычным факультэце даўно склалася добрая традыцыя адзначаць дзень нараджэння У. І. Леніна правядзеннем студэнцкай навуковай канферэнцыі.

Два дні праходзіла на гістфаку XXXVI студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 109-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Канферэнцыю адкрыла дэкан гістфака І. В. Царук.

На пленарным пасяджэнні выступіў начальнік упраўлення выкладання грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіч. Яго даклад «Задачы навуковай творчасці студэнтаў» выклікаў вялікую цікавасць прысутных. З дакладам аб выніках работы СНТ гістфака выступіў старшыня СНТ факультэта В. М. Пісараў.

Затым канферэнцыя працягвала работу па секцыях: гісторыі КПСС; этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму; гісторыі СССР дасавецкага перыяду; гісторыі савецкага грамадства; археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін; новай і навейшай гісторыі; палітычнай эканоміі; марксісцка-ленінскай філасофіі і інш.

На канферэнцыі працавалі секцыі на нямецкай і англійскай мовах.

Актыўны ўдзел у рабоце канферэнцыі прынялі не толькі студэнты стацыянара, але і студэнты вячэрняга аддзялення.

Сёння, 19 красавіка, канферэнцыя заканчвае сваю работу. На пленарным пасяджэнні будуць падведзены вынікі яе работы і ўручаны ўзнагароды за лепшыя даклады.

Правядзенне гэтай канферэнцыі было ўключана ў праграму дзён гістфака, якія ўпершыню праводзяцца на факультэце. У праграме дзён гістфака, якія праходзяць з 16 па 21 красавіка, дзень адкрытых дзвярэй, прэс-канферэнцыя, медыум, дзень спорту, дзень прафарыентацыі і закрывае гэта свята дзень адпачынку.

* * *

У сапраўднае свята студэнцкай навукі ператварылася на факультэце журналістыкі XXXVI навуковая канферэнцыя, прысвечаная 109-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Гасцямі журфакаўцаў былі студэнты Кіеўскага і Львоўскага універсітэтаў.

Адкрыў канферэнцыю дэкан факультэта прафесар Р. В. Булацкі, які адзначыў, што ў цяперашні час студэнты актыўна займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю.

Рабочая частка канферэнцыі пачалася дакладам студэнтак Е. Агеевай на тэму «Л. М. Талстой у творах У. І. Леніна, Г. В. Пляханава, А. В. Луначарскага», В. Шаліўскай — «Герцэн-памфлетыст», Н. Якімавай — «Класікі савецкага кіно — аб «вычарпальнай» крытыцы», Т. Манёнак — «Вобразнае слова ў паэзіі Пімена Панчанкі».

Потым адбыліся чарговыя пасяджэнні на секцыях тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, гісторыі журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання. Паспяхова выступіўшыя студэнты былі ўзнагароджаны граматамі.

* * *

Актыўна ўключыўся ў работу навуковай канферэнцыі юрыдычны факультэт. На пленарным пасяджэнні з дакладам «Міжнародны суд» выступіў студэнт III курса І. Сідзельнікаў; студэнт IV курса А. Нунько—з дакладам «Далейшае развіццё савецкай дэмакратыі па новай Канстытуцыі» і інш.

Удзел у падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі прынялі намеснік дэкана па навуковай рабоце дацэнт І. А. Юхо і старшыня савета СНТ факультэта В. Кошаль. Сваіх прадстаўнікоў прыслалі Варонежскі і Гродзенскі універсітэты. Канферэнцыя стала важным грамадска-палітычным мерапрыемствам, накіраваным на далейшае павышэнне творчай актыўнасці студэнцкай моладзі.

**А. МАРЧУК.**

## ЛЕНІН У МАІМ ЖЫЦЦІ

Імя Уладзіміра Ільіча Леніна для замежных студэнтаў — гэта не проста імя вялікага чалавека. Ён для іх геній, правадыр, чалавек, які зрабіў многа не толькі для свайго народа, але і для іншых народаў свету.

На рад пытанняў адказвае в'етнамскі аспірант То Туан.

**— Скажыце, калі ласка, калі вы ўпершыню пачулі пра Леніна?**

— Гэта было яшчэ ў школе, калі наша настаўніца расказвала пра Савецкі Саюз, першую краіну сацыялізму. І вось тут мы ўпершыню пачулі пра Уладзіміра Ільіча Леніна, вялікага правадыра, чыё жыццё непарыўна звязана з Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй. А пасля я самастойна прачытаў кнігу «Юнацтва Леніна», якая надоўга засталася ў маёй памяці.

**— А ці ёсць у вас любімыя творы Уладзіміра Ільіча?**

— Безумоўна. Творы Леніна захапляюць мяне велічнасцю думкі, вастрынёй праблем. Яны і цяпер не трацяць сваёй актуальнасці. З тых твораў, якія я вывучаў, мне хочацца выдзеліць «Вялікі пачын». Гэта работа аб прынцыпах будаўніцтва камунізму, пра камуністычны суботнік. Бессмяротныя радкі яго твораў вучаць жыць і змагацца народы ўсіх кантынентаў. Гэта не проста тэорыя, але і кіраўніцтва да дзеяння.

**— Якія рысы характару вялікага правадыра вы асабліва цэніце?**

— Прастату. Ленін — вельмі просты чалавек. Ён просты, як праўда.

**Гутарку вяла Я. ЗАХАР, студэнтка II курса факультэта журналістыкі.**

## ПРЫСВЕЧАНАЯ 35-ГОДДЗЮ ПНР

**Аддзяленне таварыства савецка-польскай дружбы БДУ, дэканат і СНТ гістарычнага факультэта 18 красавіка правялі навуковую канферэнцыю выкладчыкаў і студэнтаў гістфака і кафедры навуковага камунізму, прысвечаную 35-годдзю Польскай Народнай Рэспублікі.**

**Уступным словам канферэнцыю адкрыла старшыня савета аддзялення польска-савецкай дружбы БДУ, дэкан гістарычнага факультэта, доктар гістарычных навук, прафесар І. В. Царук.**

**На канферэнцыі з дакладам «Народнай Польшчы — 35 год» выступіў консул Генеральнага консульства ПНР у Мінску Казімеж Коцунь.**

**З дакладамі на канферэнцыі выступілі таксама адказны сакратар аддзялення савецка-польскай дружбы, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт В. В. Бяньkоўскі і намеснік старшыні аддзялення савецка-польскай дружбы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Л. В. Лойка. Іх даклады «ПНР на шляху да развітога сацыялізму» і «Здзяйсненне сацыялістычнай індустрыялізацыі ў ПНР» выклікалі вялікі інтарэс слухачоў.**

**З цікавымі паведамленнямі на канферэнцыі выступілі выкладчык Т. Г. Шман, стажор-выкладчык Н. А. Царук, студэнты А. С. Цярэня, Т. Э. Прыстром, Н. С. Даніленка, Е. М. Тоўсцікава, О. Ф. Юрчанка.**



Усё, што звязана з жыццём і дзейнасцю Уладзіміра Ільіча Леніна, выклікае вялікі інтарэс не толькі ў нашай краіне, але і ў іншых краінах свету. У музеях У. І. Леніна заўсёды людна, іх экспанаты прыцягваюць і моладзь і людзей старэйшага пакалення.

**На здымках:** у Цэнтральным музеі У. І. Леніна ў Маскве; музей У. І. Леніна ў г. Кракаве (ПНР).

Фота **У. Будая.**



# ШТО, ТАМ ЗА ДЫПЛОМАМ?

**Мноства праблем, мноства складаных сітуацый узнікаюць часам пры размеркаванні выпускнікоў. Гэтыя праблемы кранаюць не толькі саміх студэнтаў, але і работнікаў сістэмы вузаўскай адукацыі — тых, хто падрыхтаваў маладых спецыялістаў, а зараз разам з іншымі «зацікаўленымі бакамі» павінен забяспечыць кожнаму выпускніку магчымасць творчага, найбольш поўнага прымянення патэнцыялу атрыманых ведаў.**

**Аб тым, як вырашаюцца гэтыя задачы, расказвае першы намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ.**

— На стале камісіі ляжыць спіс, у якім пералічаны прадпрыемствы і ўстановы, якія маюць патрэбу ў спецыялістах. Указаны і пасада, і аклад, і жыллёвыя ўмовы. Кожны выпускнік, зрабіўшы выбар, ставіць свой подпіс. Але не ўсім вядома, якая вялікая праца папярэднічала гэтаму дакументу...

— Размеркаванне маладых спецыялістаў вядзецца пры дапамозе складанага, але дакладна адладжанага механізму — сістэмы дзяржаўных планаў. Самы галоўны — міжрэспубліканскі Дзяржплан СССР. На аснове гэтага плана складаюцца рэспубліканскія, ведамасныя (у тым ліку і план нашага міністэрства). Гэта свайго роду «вагі», на якіх збалансіраваны, з аднаго боку — прадугледжаны выпуск спецыялістаў тых або іншых прафесій, а з другога — патрэбнасць у іх: колькі патрэбна кожнаму ведамству, той або іншай арганізацыі. Пры вялікіх маштабах і складанай структуры нашай народнай гаспадаркі без такіх карпатлівых разлікаў не абысціся. Але гэта праца цалкам акупляецца тым, што кожны ўчарашні студэнт атрымлівае любімую работу, а кожная галіна, кожны завод ці саўгас забяспечваецца кадрамі ў меру патрэбнасці, у патрэбныя тэрміны.

— І ўсё ж адна справа, калі па плану вядзецца забеспячэнне металам, энергіяй, тэхнікай, і зусім іншае, калі «адзінкі ўліку» — не тоны, не кілават-часы, а людзі...

— Прававыя нормы, якія рэгулююць размеркаванне маладых спецыялістаў, як і ўсе нашы законы, адлюстроўваюць клопат дзяржавы аб грамадзянах Краіны Саветаў. Камісія па размеркаванню не будзе разлучаць мужа і жонку, паклапоціцца, каб сын ці дачка атрымалі работу па месцу жыхарства састарэлай маці.

Горш, калі гуманнасць закона становіцца «выратавальным кругам» для тых, хто любымі сродкамі хоча пазбегнуць «глыбінкі», усімі праўдамі і няпраўдамі чапляецца за цёпленькае месца. Колькі часу ідзе на разгляд «чалабітных», напісаных у самым слёзным тоне і напічканых выдуманымі прычынамі! Срога падыходзім мы і да неапраўданых персанальных заявак. Бывае, прыходзіць з якой-небудзь арганізацыі папера вось такога зместу: нам патрэбен выпускнік Іваноў і толькі ён — без гэтага чалавека прама-такі ўстанова развальваецца. А гэты Іваноў ці Пятроў амаль апошні ідзе па размеркаванню, на практыцы ў той арганізацыі нічым не вызначыўся — чаму ж мы павінны пасылаць яго, а не выдатніка Сідарава? (Ларчык адчыняецца проста: там працуе сваяк троечніка Іванова). Другая справа, калі персанальная заяўка прыходзіць, напрыклад, на выпускніка, які выдатна зарэкамендаваў сябе ў час практыкі на даным прадпрыемстве, напісаў дыпломную работу, якая ўяўляе вялікі інтарэс для гэтага прадпрыемства.

— Давайце разгледзім цяпер больш дэталёва такую сітуацыю: у студэнта ці студэнткі да канца вучобы паяўляецца пярсцёнак на правай руцэ...

— Я ўжо гаварыў, камісія па размеркаванню заўсёды ўважліва адносіцца да сямейных абставін. Каханне, шлюб — з'явы натуральныя, і студэнты не складаюць выключэння. Але хацелася б сказаць аб адной праблеме, якая не закранаецца прававымі нормамі. Гэта праблема маральная. Сапраўды, застаецца толькі пашкадаваць тых, хто прыбягае на размеркаванне амаль з ЗАГСА, пераможна патрасае шлюбным пасведчаннем, на якім і чарніла не паспела высахнуць (такое таксама прыходзілася бачыць). Вядома, мінская прапіска мужа ці жонкі, дзеля якой заключан шлюб, дапаможа застацца ў сталіцы. Але якая прапіска гарантуе шчасце, каханне, духоўнае багацце?

Барацьба з мяшчанствам, унутранай беднасцю — работа доўгая, складаная. Робячы ўпор на прафесіянальную падрыхтоўку, мы часам бываем не заўсёды ўважлівымі да маральнага выхавання будучых камандзіраў прадпрыемства. Гэта сказваецца на маральным абліччы маладога чалавека. Ён лічыць за лепшае, схаваўшы дыплом у камод, прыбіраць тратуары, чым працаваць інжынерам там, дзе тратуараў пакуль яшчэ не праклалі...

— Але здараецца і так: малады спецыяліст прыязджае на месца прызначэння, а яму, напрыклад, прапаноўваюць работу не па спецыяльнасці...

— Як паказвае вопыт, такія канфлікты параўнальна рэдкія. Бо план, па якому размяркоўваюцца выпускнікі, зацвярджаецца Саветам Міністраў і атрымлівае сілу закона. Як толькі «пацярпеўшы бок» звернецца ў адпаведныя інстанцыі, да вінаўных у такім парушэнні будуць прыняты меры.

Больш цяжка з жылплошчай. Пункт «Палажэнне аб размеркаванні», які абавязвае арганізацыю забяспечыць маладога спецыяліста жыллём «ва ўстаноўленым парадку», трактуецца кіраўнікамі па-рознаму. На адных прадпрыемствах, спасылаючыся на вастрыню жыллёвага пытання, па сутнасці справы вымушаюць маладога чалавека ці маладую сям'ю сваімі сіламі шукаць дах над галавой. На другіх — узяць хаця б мінскія аўтамабільны завод і завод шасцерань, Аршанскі льнокамбінат — робяць усё магчымае, каб на першых парах забяспечыць маладых спецыялістаў месцамі, а сем'і — пакоямі ў інтэрнаце, затым прадастаўляюць ім ільготы для атрымання кватэр.

І ў гэтым годзе камісіі па размеркаванню адмовілі ў заяўках раду арганізацый, якія вырашылі не абцяжарваць сябе клопатамі з жыллём для маладых спецыялістаў. Пытанне гэта складанае, шматграннае, якое патрабуе многа сіл, часу, нерваў. Мне здаецца, не пашкодзіла б узмацніць адказнасць арганізацый за незабеспячэнне маладых спецыялістаў нармальнымі ўмовамі (у тым ліку і жыллёва-бытавымі) для паўнакроўнай творчай работы. Напрыклад, прадаставіць камісіям па размеркаванню права адмаўляць у заяўках тым прадпрыемствам і ўстановам, якія не гарантуюць выпускнікам такіх умоў (у існуючым «Палажэнні» гэта дазваляецца толькі ў асобных выпадках).

Такім чынам, праблемы, звязаныя з размеркаваннем маладых спецыялістаў, павінны рашацца ў двух напрамках. З аднаго боку, патрэбна далей удасканальваць сам «механізм» размеркавання, павышаць адказнасць арганізацый, міністэрстваў, ведамстваў. З другога боку, не менш важным момантам з'яўляецца маральнае выхаванне юнакоў і дзяўчат — будучых камандзіраў прадпрыемства, урачоў, юрыстаў ці настаўнікаў. Бо радкі, якія заўтра адкрыюць першую старонку іх працоўнай біяграфіі, будуць пісацца іх жа рукамі.

**Гутарку вёў А. КЛАСКОЎСКІ.**

(«Знамя юности», 6 красавіка 1979 г.).

## ПА БДУ — ІНФАРМАЦЫЯ

Адбылося чарговае пасяджэнне жыллёва-бытавой камісіі прафкома універсітэта. Члены камісіі слухалі справаздачу аб рабоце аператрада, з якой выступіў намеснік камандзіра атрада А. Траццякоў. Ён паведаміў, што дзяжурствы ва ўсіх атрадах праходзяць на патрэбным узроўні, акрамя атрада інтэрната № 2. Добра наладжана работа ў інтэрнаце № 7 (камісар атрада Блінкоўскі).

На пасяджэнні было таксама зацверджана палажэнне аб сацыялістычным спаборніцтве «за культуру быту» паміж інтэрнатамі, размеркаваны месцы паміж факультэтамі. Першае месца заняў механіка-матэматычны факультэт, на 2-м і 3-м месцы адпаведна фізфак і гістфак.

**Л. ЦУКАНАВА.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

* * *

Адбыўся чарговы пленум камітэта камсамола БДУ. На ім з дакладам аб арганізацыі і правядзенні Ленінскага заліку ў камсамольскіх арганізацыях факультэтаў выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце М. Р. Прыгодзіч.

Пленум вызваліў ад абавязкаў сакратара камітэта камсамола А. А. Тозіка ў сувязі з пераходам на іншую работу і зацвердзіў сакратаром камітэта камсамола БДУ кандыдата гістарычных навук П. І. Брыгадзіна.

* * *

На пасяджэнні савета Белдзяржуніверсітэта, якое адбылося 16 красавіка, выступіў дырэктар выдавецтва БДУ В. С. Грыгор'еў. Ён далажыў савету аб рабоце выдавецтва.

З дакладам «Аб рэалізацыі плана мерапрыемстваў па набору студэнтаў у 1979 годзе» выступіў сакратар прыёмнай камісіі дацэнт Р. А. Жмойдзяк.

Старшыня камісіі па праверцы выканання рашэнняў савета прафесар А. Ц. Пікулеў праінфармаваў савет аб выкананні рашэнняў савета, прынятых у бягучым навучальным годзе.

* * *

Падведзены вынікі агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці факультэтаў БДУ. Месцы размеркаваны наступным чынам:

I — гістарычны факультэт;
II — факультэт журналістыкі;
III — радыёфізікі і электронікі;
IV — механіка-матэматычны;
V — філалагічны, біялагічны;
VI — геаграфічны факультэт;
VII — факультэт прыкладной матэматыкі;
VIII — юрыдычны факультэт;
IX — хімічны факультэт;
X — фізічны факультэт.



**На здымку:** на пленуме камітэта камсамола выступае М. Прыгодзіч.

Фота **М. Дубовіка.**

# СВЯТА СВАБОДНАЙ ПРАЦЫ

Арганізавана ідзе камуністычны суботнік на журфаку. Студэнты III курса працавалі на факультэце: прыбіралі памяшканне, мылі вокны. Другакурснікі дапамагалі рабочым на будаўніцтве жылых дамоў на вул. Танкавай і на Паркавай магістралі. Студэнты I і II курсаў ускапвалі газоны на вул. К. Лібкнехта, а чацвёртакурснікі працавалі на добраўпарадкаванні тэрыторыі комплекса захоўвання будматэрыялаў у вёсцы Шабаны.

**В. ЧАРНУШЭНКА.**



**На здымку:** студэнты журфака ў час камуністычнага суботніка.

**Фота Т. НАРКЕВІЧ.**

Пераможна крочыць па краіне камуністычны суботнік... Штодзённа прыходзяць новыя звесткі аб калектывах, якія прынялі ўдзел у вялікім свяце працы.

10 красавіка на камуністычны суботнік, прысвечаны 109-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, выйшлі студэнты біялагічнага факультэта нашага універсітэта. У той дзень ім прадстаяла працаваць на розных прамысловых аб'ектах беларускай сталіцы: на аўтамабільным і фарфоравым заводах, камбінаце будаўнічых матэрыялаў, спецаўтабазе.

Прыслалі заяўкі выдавецтва ЦК КПБ, трэст «Мінскпраектбуд», трэст зялёнай гаспадаркі.

Суботніку папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа па яго арганізацыі і паспяховаму правядзенню. Так, перад кожнай вучэбнай групай была пастаўлена задача, вызначан аб'ект работы. Былі зацверджаны адказныя за правядзенне суботніка на факультэце — сакратар камітэта камсамола Уладзімір Касцюк і член партыйнага бюро Уладзімір Міхайлавіч Чарнагузаў. Пасля суботніка я спытаў Уладзіміра Міхайлавіча:

— Што, на Ваш погляд, найбольш характарызуе работу студэнтаў факультэта на камуністычным суботніку?

— Добрасумленнасць кожнага. Усе працавалі з агеньчыкам, з ініцыятывай.

Уладзімір Касцюк дабаўляе:

— Пацвярджэннем гэтага могуць служыць водгукі аб рабоце нашых студэнтаў, якія мы атрымалі ад кіраўнікоў тых арганізацый, у якіх працавалі. Прараб спецаўтабазы лічыць, што калектыў супрацоўнікаў кафедры мікрабіялогіі і фізіялогіі раслін, якім кіраваў А. М. Кульба, заслугоўвае асобай падзякі. Добра працаваў і калектыў студэнтаў V курса (кафедра генетыкі) на камбінаце будаўнічых матэрыялаў. Кіраваў групай асістэнт кафедры Мікалай Луконін.

Бадай, з найбольшай зацікаўленасцю працуюць студэнты факультэта па добраўпарадкаванню Мінска. Яно і зразумела: работа гэта бліжэй студэнтам-біёлагам. Першакурснікі працавалі на вуліцы Карла Лібкнехта Маскоўскага раёна беларускай сталіцы.

Добра папрацавалі на ленінскім суботніку Таццяна Кухарэнка, Зоя Ішчанка, Марыя Бубнова — студэнткі III курса, Ала Тынянская — студэнтка V курса біялагічнага факультэта. Замест 400 чалавек па разнарадцы працавала 440 студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта.

Мае субяседніцы — намесніцы сакратара камітэта камсамола біяфака па ідэалагічнай рабоце і грамадска-палітычнай практыцы Наташа Няхайчык і Тамара Сушкевіч. Яны лічаць, што галоўнай умовай паспяховай работы з'яўляецца трывалы, згуртаваны калектыў.

А такі калектыў на біяфаку сапраўды існуе.

**С. АЛЯКСЕЕЎ.**

# РАСШЫРАЦЬ ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ

Сяброўскія сувязі з замежнымі ВНУ — адно з актуальных пытанняў не толькі ў галіне навуковай і вучэбнай, але і ў ідэалагічнай рабоце. Таму, расшыраючы абмен вучонымі, аспірантамі і студэнтамі з замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, наш універсітэт умацоўвае дружбу з імі, прапагандуе за мяжой ідэі марксізму-ленінізму, дасягненні СССР і Беларускай ССР, выкарыстоўвае вынікі навуковага абмену для павершэнства вучэбна-метадычнай і навуковай дзейнасці.

Наш універсітэт цесна супрацоўнічае з Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (ГДР), Сафійскім імя К. Ахрыдскага (НРБ), Люблянскім (СФРЮ), Ягелонскім (ПНР, г. Кракаў), універсітэтамі г. Камагуэй (Куба) і імя М. Лютэра ў Гале (ГДР).

Вучоныя нашага універсітэта прымаюць актыўны ўдзел у міжнародных канферэнцыях, сімпозіумах. Некаторыя з іх праходзяць за мяжой навуковую стажыроўку. Расшыраецца ў нас і такая форма, як доўгатэрміновая педагагічная работа нашых выкладчыкаў у ВНУ сацыялістычных і развіваючыхся краін.

Абмен групамі студэнтаў на вытворчую і азнаямленчую практыку даўно стаў трывалай і праверанай формай супрацоўніцтва з замежнымі ВНУ. У 1978 годзе БДУ накіраваў за мяжу 191 чалавека, з якіх 166 — у сацыялістычныя, 17 — у развіваючыяся і 8 — у капіталістычныя краіны.

Асабліва ў апошні час павялічылася колькасць паездак для навуковай работы і навуковых стажыровак, на доўгатэрміновую педагагічную работу. Неабходна адзначыць, што павысілася актыўнасць замежных камандзіровак. Так, напрыклад, дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі, дацэнт А. А. Лабуда за тры тыдні работы ў Сафійскім універсітэце правёў сумесныя кантрольныя вымярэнні параметраў плазмы на ўстаноўках, абмеркаваў з вучонымі вынікі даследаванняў 1978 года. Па выніках гэтай работы быў зроблен даклад на VIII нацыянальным кангрэсе «Аптычныя даследаванні струменяў нізкатэмпературнай плазмы па атамнай спектраскапіі» ў г. Варне і падрыхтаван сумесны артыкул для навуковага часопіса.

Вынікам цеснага супрацоўніцтва прафесара Д. Б. Мельцара з гісторыкамі Сафійскага універсітэта з'явілася сумесная кніга «Нацыянальнай свабодзе Балгарыі — 100 год». Гэта ўжо трэцяя кніга Д. Б. Мельцара, напісаная па выніках паездак у НРБ.

Вучоныя ВНУ-партнёраў вядуць навукова-даследчыя работы па 16 тэмах.

Значна расшырылася супрацоўніцтва з універсітэтам горада Камагуэй (Куба), на пятым хімічным факультэце якога працуюць тры нашы спецыялісты. На асноўных факультэтах трэці год узначальваюць навуковую і вучэбна-метадычную работу такія высокакваліфікаваныя спецыялісты, як дацэнт В. П. Кірліца, Ф. С. Фешчанка, А. Е. Глебаў, А. П. Яльніцкі.

Для дапамогі ў арганізацыі матэматычнага факультэта і чытання лекцый у Камагуэй выязджаў дацэнт А. В. Самусенка. Два месяцы знаходзіўся ў брацкай ВНУ і дацэнт В. С. Мячкоўскі. Ён удзельнічаў ва ўстаноўцы хімічнага абсталявання і арганізацыі эксперыментальных даследаванняў. Белдзяржуніверсітэт у 1978 годзе прыняў 148 спецыялістаў замежных ВНУ.

У нашым універсітэце працавалі вучоныя з Індыі (Р. С. Вага і Р. Н. Менон), Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (Т. Трэф) і многія іншыя.

Вынікам сумеснай работы індыйскіх і савецкіх спецыялістаў з'явіўся падрыхтаваны да друку вучэбны комплекс па рускай мове для студэнтаў-нефілолагаў індыйскіх універсітэтаў (сумесна са старшым выкладчыкам БДУ У. Г. Будаем).

Доктар Т. Трэф аказаў вялікую дапамогу НДІ прыкладных фізічных праблем. Ён даў кансультацыю па найбольш рацыянальнаму размяшчэнню вузлоў камбінаванай вакуумнай сістэмы паскаральніка, у цэлым распрацавана і вычарчана сістэма карэкцыі іёнаправода ЭСУ-2, у якой ужо ўлічаны ўсе станоўчыя і адмоўныя моманты эксплуатацыі аналагічных сістэм за мяжой. У цяперашні час сістэма карэкцыі выраблена і ўстаноўлена на паскаральніку ў НДІ ПФП.

Як бачым, узаемаабмен з замежнымі ВНУ прыносіць вялікую карысць. Таму неабходна ўсяляк расшыраць і развіваць супрацоўніцтва з ВНУ-партнёрамі, выкарыстоўваць новыя формы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

**І. ЧЭПА.**

# Там, дзе ёсць сапраўдны калектыў

Біялагічны факультэт па выніках сацыялістычнага спаборніцтва займае першае месца ва універсітэце, а 5-я група IV курса прызнана лепшай не толькі на факультэце, але і ва універсітэце.

— У чым жа сакрэт поспеху? — пытаюся ў студэнтаў гэтай групы.

На пытанне адказвае староста Іван Палітыка:

— Ніякага «сакрэту» тут, здаецца, няма. Поспех, па-мойму, залежыць не ад аднаго-двух студэнтаў, а ад усіх разам. Наша першае месца — гэта і грамадская работа, і работа над самім сабой, над падручнікамі і канспектамі. Як вынік — паспяховая здача экзаменаў.

Душа нашага калектыву — камсорг Валянціна Тарасевіч. У яе за плячыма вялікі вопыт камсамольскай работы. Галоўныя рысы яе характару — шчырасць, чуласць, уважлівасць, неабыякавасць да ўсіх з'яў нашай рэчаіснасці. Валянціна — ініцыятар многіх цікавых спраў у групе. Словы яе ніколі не разыходзяцца са справай...

Размаўляючы з Валяй, я яшчэ раз упэўніўся ў праўдзівасці слоў старасты. Але заўважыла яшчэ адну рысу характару дзяўчыны — сціпласць. (Яна амаль нічога не гаварыла аб сабе, больш аб справах у групе, аб сябрах). На пытанне аб «сакрэтах» поспеху групы Валя адказала:

— У першую чаргу вялікую ролю адыгрываюць адносіны саміх студэнтаў да вучобы, а яны ў нас самыя сур'ёзныя. Кожны з камсамольцаў групы мае даручэнне і добрасумленна выконвае яго. Напрыклад, кіраўнік лектарскай групы, якая лічыцца лепшай ва універсітэце, Аня Жывіцкая змагла так паставіць сваю работу, што зацікавіла ёю іншых.

Сяргей Крупенка, Надзя Сіманава, Раіса Сулімава ўзялі на сябе абавязкі грамадскіх куратараў і дапамаглі цікава і на высокім палітычным узроўні правесці Ленінскі ўрок і ў нас і на першым курсе.

Надоўга запомніцца ўсім нам вечар пасвячэння першакурснікаў у студэнты, вечар паэзіі, які быў праведзен у ГПТВ-12, вечары адпачынку ў інтэрнаце. Актыўна ўдзельнічалі ў іх правядзенні Таццяна Сляпіца, Андрэй Фамічоў, Сяргей Пілевіч і іншыя.

Не так даўно закончылася грамадска-палітычная атэстацыя, дзе па-дзелавому і прынцыпова ацэньвалася работа кожнага камсамольца. Расказ Валянціны Тарасевіч працягвае Вольга Сычова, член камсамольскага бюро групы:

— Да ўсяго сказанага трэба дабавіць, што ў нас ёсць пэўныя поспехі і ў навуковай рабоце. Алег Мірашнічэнка заняў першае месца на Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Рэгулярна чытаюцца даклады на пасяджэннях навуковых гурткоў.

Вялікую ролю адыгрывае і тое, што ўсе свае справы мы праводзім сумесна, дапамагаючы адзін аднаму. Калі трэба ў чым-небудзь дапамагчы свайму сябру, то адмовы не бывае.

Вынікі размовы падводзіць Міхаіл Васільевіч Шалух, куратар групы:

— Відаць, дапамагае рабятам ва ўсім уважлівасць адзін да аднаго. А там, дзе ёсць сапраўдны калектыў, там сіла і поспех.

**Ірына ГУСЬКО.**



**Пяты курс, завяршаючы курс. Падышлі к канцу вясёлае студэнцкае жыццё, вучоба з яе цікавымі лекцыямі і семінарамі. Хутка дзяржэкзамен...**

**НА ЗДЫМКУ: апошнія залікі па эстэтыцы ў пяцікурснікаў мехмата прымае М. А. Каральков.**

Фота **М. Дубовіка.**

● **НА КОНКУРС**

# Шчаслівыя

Калі чалавек мае магчымасць займацца любімай справай, калі яму жыць цікава і весела, то звычайна кажуць, што ён шчаслівы.

Шмат дзе ведаюць ужо гэтых юнакоў і дзяўчат — другакурснікаў філфака беларускага аддзялення. Выступалі яны з канцэртамі ў Хатлянскай сярэдняй школе Уздзенскага раёна, у вайсковай часці і, безумоўна, на сваім родным факультэце.

Я сустрэлася з Ірынай Уласавай — кіраўніком агітбрыгады, Ганнай Емяльян — старастай першай групы, на базе якой створаны гэты калектыў, і Станіславам Валейняй — удзельнікам агітбрыгады. Прапаную вашай увазе размову з імі:

**— Калі быў створан ваш калектыў?**

Ірына:

— Нарадзіўся калектыў восенню 1977 года на нашай першай бульбе, але аформіўся ў агітбрыгаду значна пазней. Першым «баявым хрышчэннем» было выступленне на «агеньчыку», прысвечаным Дню Перамогі ў Хатлянскай сярэдняй школе.

**— А як вас прымаюць гледачы!**

Станіслаў:

— Прымаюць нас усюды вельмі цёпла. Асабліва запомніўся момант, калі пасля нашага выступлення ў Хатлянскай школе дырэктар яе прыйшоў да нас і запрасіў прыязджаць яшчэ і яшчэ.

**— Як часта бываюць у вас рэпетыцыі!**

Ірына:

— Як толькі выпадае вольны час. Усе ўдзельнікі агітбрыгады ідуць на іх з задавальненнем.

**— Які нумар, на ваш погляд, у праграме найбольш цікавы!**

Ганна:

— Мы стараемся, каб усе нумары нашай праграмы былі цікавымі. Але, на мой погляд, самым цікавым з'яўляецца «Танец маленькіх лебедзяў» у выкананні чатырох хлопцаў.

**— Якое выступленне вам запомнілася больш за ўсё!**

Станіслаў:

— У нас не бывае аднолькавых выступленняў. Усе яны запамінаюцца таму, што да кожнага з іх мы рыхтуемся, уносім штосьці новае, цікавае.

Апошняе маё пытанне было да старасты групы:

**— Як уплываюць заняткі мастацкай самадзейнасцю на вучобу!**

— Станоўча. Трэба сказаць, што наша першая група, дзе займаецца большая частка ўдзельнікаў агітбрыгады, здае сесію амаль без троек. У групе 6 выдатнікаў. Усе члены агітбрыгады займаюцца на добра і выдатна.

Вось такія яны — удзельнікі агітбрыгады, на першы погляд розныя, але з адной агульнай рысай — зацікаўленасцю ў сваёй справе. І хіба можна сказаць, што яны нешчаслівыя?

**Л. ЦУКАНАВА.**

## ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# АД БАЙЦА ДА КАМАНДЗІРА

Вера добра памятае той ранак. На Мінскім вакзале сустракалі першыя будатрады. Ей, першакурсніцы мехмата, здавалася, што з вагонаў будуць выходзіць сапраўдныя цуда-асілкі з абветранымі тварамі, у пацёртых штармоўках. Але паявіліся не асілкі. Звычайныя хлопцы і дзяўчаты саскоквалі на платформу. Вера трымала ў руках букет васеньскіх кветак і не адважвалася падысці да каго-небудзь з байцоў... Так, гэты ранак не забудзецца ніколі. Праз год ужо Веру з яе таварышамі нехта сустракаў на вакзале. Іх атрад вярнуўся з Казахстана. Нават потым, на працягу гадоў, калі яна прайшла шлях ад байца лінейнага будатрада да камандзіра занальнага штаба, у Веры Прокашавай не сабралася столькі ўражанняў, як пасля першага працоўнага лета.

... Здзіўляла ўсё. Глеба, падобная на попел (Веры здавалася, што зямля проста пасівела). Далёкі-далёкі гарызонт (цяжка было паверыць, што ёсць дзе-небудзь канец гэтаму полю), і ніводнага каласка вакол (тады ўжо гаварылі пра казачныя цалінныя ўраджаі).

Для пачатку пабудавалі нешта накшталт навесаў — каб схавацца ад сонца. А пасля першага працоўнага дня ўбачылі сухавей. Здзіўляліся, смяяліся, радаваліся, а ён пранёсся міма іх навесаў — і дах (самая звычайная толь) узляцеў у паветра і чорным змеем раствараўся ў блакіце.

Потым ім прывезлі ваду. У бензавозе. У самым сапраўдным. Яшчэ ўранку на ім вазілі бензін. Днём — ваду на палі. Вечарам — для піцця. І так кожны дзень. Калі звыкліся, жартавалі:

— Як гэта? Чай ды без бензіну ўпрыкуску? Ні ў якім разе не згодны!

Вось такім было жыццё будатрадаў пятнаццаць год назад. З таго часу Вера Прокашава ў саставе СБА аб'ездзіла ўсю краіну: Урал, БАМ, Малдавію...

У Малдавіі яна працавала апошнія тры гады. Камандзірам занальнага штаба. Казалі, што працавала «на змор». У штабе былі адны хлопцы. К канцу лета амаль падалі з ног. Стамлялася і яна. Падумайце самі: кожны тыдзень пабываць у кожным са 140 атрадаў зоны. Гэта яе правіла. Не парушыла ні разу.

Яе ведалі байцы ўсіх атрадаў. Паважалі. За справядлівасць, за строгасць.

У гэтым годзе Веру Прокашаву зноў пасылаюць камандзірам Слабадзейскай зоны Малдавіі.

— Я там кожнага старшыню калгаса, кожнае поле ведаю. Лягчэй будзе працаваць. Ды калі па-праўдзе — хацелася б у іншае месца паехаць: жывое ва мне турыстка.

Так, Вера Прокашава займаецца турызмам. Дзе толькі не бывала: Каўказ, Цянь-Шань, Урал... А хутка новы маршрут — у Арктыку.

**А. УСЕНЯ.**



# І зноў гучыць музыка

ДВА дні ў Палацы культуры аўтамабільнага завода праходзіў VI конкурс духавых, эстрадных аркестраў і аркестраў народных інструментаў, прысвечаны 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Праграма складалася з класічных і сучасных твораў, шмат месца адводзілася і беларускай народнай музыцы. «Лявоніха» Е. Глебава змянялася «Хабанерай» Ж. Бізэ, «Гары, гары, мая зорка» Булахава — «Сіртакі» Тэадаракіса.

У конкурсе ўдзельнічалі 30 самадзейных калектываў з усёй рэспублікі. Кожны па-свойму арыгінальны і непаўторны.

Неспрактыкаванаму слухачу здаецца, што ўсе калектывы выступаюць аднолькава, але журы заўважае нават нязначныя памылкі ў выкананні.



Музычнасць, каларытнасць, тэхнічнасць — вось асноўныя крытэрыі, па якіх ацэньвала выступленне калектываў журы, якое ўзначаліў заслужаны дзеяч культуры БССР, загадчык кафедры народных інструментаў Белдзяржкансерваторыі імя А. В. Луначарскага Міхаіл Рыгоравіч Салапаў.

Адным з апошніх выступае народны аркестр народных інструментаў БДУ імя У. І. Леніна пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча культуры БССР М. А. Лісіцына, які з 1953 года з'яўляецца нязменным яго кіраўніком.

Многа часу прайшло з той пары, калі адбылася першая рэпетыцыя нашага аркестра. За гэты час аркестр выступаў у многіх гарадах СССР і за мяжой, неаднаразова быў лаўрэатам конкурсаў. У 1965 годзе за высокае выканаўчае майстэрства яму прысвоена званне народнага.

Хоць аркестру ўжо за трыццаць, сярэдні ўзрост яго ўдзельнікаў 20 год, усе яны студэнты нашага універсітэта. Рабяты прыходзяць сюды на першым-другім курсе і да канца студэнцкіх дзён не развітваюцца з музыкай.

У гэтым годзе на конкурсе аркестр заняў другое месца, пасля аркестра педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

Напярэдадзе выступленне ў Ленінградзе, Балгарыі. І зноў садзяцца студэнты за пюпітры — гучыць музыка, падкупляючая сваёй прастатой і шчырасцю.

**В. ШУБА,**
**інжынер СКТБ.**

# САМАЯ ВЯЛІКАЯ ЎЗНАГАРОДА

Нядаўна на хімфаку адбыўся конкурс самадзейных талентаў.

Пачыналася звычайна. Камітэт камсамола вызначыў дзень правядзення конкурсу, затым паявілася вялізная маляўнічая аб'ява і...

— Што будзем рабіць?

—А можа ты спяеш?

— Значыць, прыйдзецца без мікрафона?

На ўсіх курсах і патоках вырашаюць важную задачу: шукаюць і знаходзяць таленты. І вось, нарэшце, кульмінацыя. Стомленыя ад рэпетыцый, усхваляваныя прадстаячым выступленнем, але бестурботна шчаслівыя студэнты запаўняюць аўдыторыю. І ўзнікае цесная садружнасць артыстаў, гледачоў, журы. Апошнія падрыхтаванні і настаўленні: артыстам — быць смялейшымі і мець выгляд паярчэй; гледачам — быць больш актыўнымі і больш апладзіраваць; журы — быць аб'ектыўным.

Конкурс адкрыт. Першым выступае вакальна-інструментальны ансамбль першага і другога курсаў. Гэта дэбют, і даволі ўдалы. Перш за ўсё гэта ацэньваюць гледачы. А далей — песні, вершы, гумарэскі, сцэнкі з жыцця хімікаў і нават гімнастычныя нумары.

Асабліва добра выступаў IV курс, студэнты якога расказалі аб сабе, вучобе сродкамі жанраў эстрады.

Ніхто не заўважыў, як праляцеў час. Конкурс падышоў к канцу. І не так важна, хто будзе першым. Стараліся ўсе. Самая вялікая ўзнагарода — апладысменты і смех гледачоў.

**Т. ЛАПКОЎСКАЯ.**

# ГАЛОЎНЫ ВОРАГ—ФАРМАЛІЗМ

ДЗЕВЯЦЬ год існавання факультэта прыкладной матэматыкі — дастатковы тэрмін для таго, каб можна было параўнаць цяперашнія поспехі і дасягненні факультэта з мінулымі. У спорце такое параўнанне не на карысць сучаснага. Факультэт, які займаў раней першыя месцы ў спартакіядзе БДУ, вось ужо 2 гады знаходзіцца на 5-м месцы. Чаму? Можна знайсці бясконцае мноства тлумачэнняў такому становішчу, але ёсць агульныя прычыны, якія, па-мойму, уплываюць не толькі на выступленне асобных факультэтаў у спартакіядзе, але і на выступленні універсітэта на першынствах ВНУ.

Пачнём з універсітэцкай спартакіяды. Існуюць і палажэнне аб ёй і праграма яе правядзення.

У палажэнні ёсць пункт, што агульнае кіраўніцтва спартакіядай здзяйсняецца аргкамітэтам. Але чамусьці ні разу я не бачыў на пасяджэннях праўлення спортклуба, дзе вырашаюцца пытанні па правядзенню спартакіяды, усіх членаў аргкамітэта. Можа ў гэтым і няма патрэбы? Не ведаю, але я так не лічу.

Палажэнне і праграма правядзення спартакіяды, прама скажам, не вызначаюцца сваёй канкрэтнасцю і аб'ектыўнасцю. Спачатку аб палажэнні. У ім гаворыцца: «Агульнакаманднае першынство факультэтаў вызначаецца па найбольшай суме ачкоў, набраных у залікавых відах, падзеленых на залікова каэфіцыент». У ФПМ такі каэфіцыент роўны 18. У фізфака і мехмата столькі ж. Быццам бы ўсё ў парадку: у вялікіх факультэтаў — вялікі каэфіцыент. Вось гэтым і кіраваўся спортклуб пры складанні праграмы. Але тут яўная фармальнасць. Не ўлічаны магчымасці факультэтаў выканаць праграму спартакіяды. Спартакіяда БДУ праводзіцца па 24 відах спорту. Паводле грубых падлікаў у 18 з 24 відаў спорту мужчыны прыносяць львіную долю ачкоў. А што гаварыць аб ФПМ (а таксама, напрыклад, аб філфаку), калі ў нас на першых трох курсах больш чым з 800 студэнтаў, рабят, якія могуць удзельнічаць у спаборніцтвах, усяго каля 200! У фізікаў прапорцыя адваротная. Але... каэфіцыент адзін і той жа. Трэба шукаць нейкае выйсце. Колькі разоў гаварылася, што такое палажэнне недасканалае, але ўжо 2 гады яно практычна не мяняецца. Спортклубу трэба падумаць над гэтым.

Ёсць і іншыя недахопы ў палажэнні. Скласці аптымальнае палажэнне даволі цяжка, але гэта трэба ўсё-такі зрабіць.

Аб праграме. У ёй вызначаны арыенціровачныя тэрміны правядзення спаборніцтваў. Іменна арыенціровачныя. Я разумею, што дакладныя тэрміны вызначыць вельмі цяжка, але калі ў адну нядзелю праходзяць спаборніцтвы адразу па некалькіх відах спорту, то пачынаеш задумвацца, каму гэта трэба.

А як праходзяць спаборніцтвы? Звычайна ніякай інфармацыі аб іх правядзенні няма ва універсітэце. Аб маючай адбыцца спартыўнай сустрэчы ведаюць толькі старшыні спортбюро факультэтаў ды ўдзельнікі спаборніцтваў. Зрэдку ў галоўным корпусе паяўляюцца аб'явы. Спартыўнай нагляднай агітацыі ў нас практычна няма. Але ж ёсць кім ганарыцца універсітэту! Ёсць жа фотаздымкі вядомых спартсменаў, цяперашніх і былых студэнтаў БДУ, але чамусьці гэтыя фотаздымкі вісяць толькі ў спортклубе. Патрэбна ж, каб аб лепшых спартсменах БДУ ведалі ўсе студэнты. Універсітэт удзельнічае ў многіх спаборніцтвах, часам паспяхова, часам наадварот, але адно застаецца пастаянным —ніякай інфармацыі аб гэтых спаборніцтвах няма. Здаецца, усё гэта дробязі, але з дробязей складаецца вялікае — адносіны да спорту.

Складаецца ўражанне, што дапамога камітэта камсамола БДУ заключаецца толькі ў тым, што ён даў сваіх прадстаўнікоў у аргкамітэт, які існуе толькі на паперы. Ды і аб якой дапамозе можа ісці размова, калі развіццё спорту — адна з пярвейшых і галоўнейшых задач камсамола. Тут патрэбна не дапамога, а жывы ўдзел.

Можа ва ўсіх закранутых тут пытаннях шмат спрэчнага. Я прапаную выказацца ўсім, хто не ставіцца абыякава да развіцця спорту ў БДУ. Бо толькі сумеснымі намаганнямі можна дабіцца лепшага.

**К. ЗУБОВІЧ,**
**старшыня спортклуба ФПМ, член камітэта камсамола.**

# Патрэбна працаздольнасць

Кожны дзень пасля заняткаў прыходзіць на стадыён Віктар Якаўлевіч Шпігаў — трэнер, майстар спорту СССР, кіраўнік адной з груп секцыі лёгкай атлетыкі, каб правесці трэніроўку, перадаць веды і вопыт малодшаму пакаленню спартсменаў.

Кожны год у секцыю прыходзяць новыя людзі. Адны застаюцца, а другія, не вытрымаўшы нагрузак, пераходзяць на агульныя заняткі фізкультурай.

**— Цікава, Віктар Якаўлевіч, а як прыйшлі Вы ў лёгкую атлетыку?**

— Жаданне было займацца чым-небудзь карысным. Выбраў спорт, лёгкую атлетыку. Яшчэ хацелася даказаць, што добрых вынікаў у спорце можа дабіцца амаль кожны.

**— Як Вы ацэньваеце свой першы поспех?**

— У 1961 годзе першы раз выканаў норму II спартыўнага разраду. Праз тры гады стаў першаразраднікам, а затым ужо кандыдатам у майстры спорту. З 1970 года — майстар спорту. Вынікі маглі быць лепшымі, калі б займаўся не самастойна, а пад кіраўніцтвам трэнера. Расчаравання не было ніякага, але толькі час ад часу мучыла сумненне, што можа ў іншых відах спорту змог бы дасягнуць большага.

**— З якім пачуццём і настроем звычайна Вы выходзілі на старт?**

— Мэтай была перамога, імкненне палепшыць свой асабісты вынік, абавязкова быць прызёрам, а калі моцны праціўнік, — дык прайграць яму як магаменш, а праз некаторы час — абыграць яго.

**— Хто з Вашых вучняў дабіўся ў спорце вялікіх поспехаў?**

— У першую чаргу трэба адзначыць І. Шыша, які стаў майстрам спорту і членам зборнай рэспублікі, а таксама кандыдатаў у майстры спорту А. Пулача, В. Гардыка і большую частку першаразраднікаў. Да іх поспех прыйшоў як вынік працавітасці, веры ў сябе і свайго настаўніка.

**— Як праводзіцца адбор студэнтаў першых курсаў у секцыю?**

— Адбіраем часцей за ўсё па жаданню. Поспехаў, як правіла, дабіваюцца тыя, хто рэгулярна ходзіць на трэніроўкі, не шкадуе часу на спорт.

**— Якая нагрузка патрэбна спартсмену, каб той змог паказаць высокі вынік?**

— Усё залежыць ад індывідуальных здольнасцей чалавека. Нагрузка можа быць малая па аб'ёму, але вялікая па інтэнсіўнасці ці наадварот.

**— Кожны год зборная універсітэта па лёгкай атлетыцы праводзіла веснавыя трэніровачныя зборы ў Ялце. Чым гэта карысна спартсмену?**

— Як вядома, у гэтым годзе такіх збораў не будзе. Але яны неабходны нашым спартсменам для фізічнай нагрузкі і псіхалагічнай разгрузкі. Без такіх збораў цяжка будзе захаваць на працягу доўгага часу спартыўную форму.

**Запісаў М. КАСЯК.**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 633. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 08705